## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Алмакучуков, К. М. Маркетинговое управление сферой культуры : автореф. дис. … д-ра экон. наук : 08.00.05 / К. М. Алмакучуков ; Рос. экон. ун-т им. Г. В. Плеханова. – М., 2015. – 36 с.
2. Адрианова, Т. О. Социальные функции театра / Т. О. Адрианова // Вестник Челябинского государственного университета. Философия. Социология. Культурология. – 2012. – Вып. 28. – С. 91–94. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/v/sotsialnye-funktsii-teatra. – Дата доступа: 15.02.2021.
3. Рязанцева, Е. PR-технологии в продвижении театрального продукта [Электронный ресурс] / Е. Рязанцева, Н. В. Апажихова. – Режим доступа: www.tsutmb.ru/nauka/internet-konferencii/6-visheslovatskie-chtenia/ryzanceva.pdf. – Дата доступа: 18.03.2021.
4. Маркетинг в театрах XXI века. Как Большой театр Беларуси работает над продвижением и борется за зрителя [Электронный ресурс] // ClassicalMusicNews.Ru. – Режим доступа: https://www.classicalmusicnews.ru/reports/bolshoy-teatr-belarusi-pr-2017/. – Дата доступа: 20.03.2021.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хомутова И. В., магистрант
Научный руководитель – Кухто Л. К.,
кандидат культурологии, доцент

# АГРАРНА-МАГІЧНАЯ СЕМАНТЫКА КАЛЯДНЫХ АБРАДАЎ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

Ва ўмовах глабалізацыі каштоўнасці і дасягненні толькі тэхнагеннай цывілізацыі, якія б вялікія яны ні былі, не здольны забяспечыць усеабдымнае навуковае спасціжэнне культурнай спадчыны. У сувязі з гэтым, актуальна пытанне аб стварэнні прадуманай канцэпцыі сацыяльных, псіхалагічных і культурных умоў пазнання духоўных каштоўнасцей у іх

лакальна-рэгіянальных версіях. На тэрыторыі Заходняга Палесся яны яшчэ існуюць як жывая з’ява сучаснай культуры, функцыяніруюць у выглядзе лакальных фальклорна-этнаграфічных комплексаў, але не заўсёды прадстаўлены ў навуковым дыскурсе, у прыватнасці даследванне іх аграрна-магічнай семантыкі.

В. Я. Проп у працы «Рускія аграрныя святы» адзначаў, што калі вывучаць ўвесь гадавы цыкл святаў, то адразу кідаецца ў вочы, што паміж асноўнымі з іх, пры ўсіх адрозненнях, маецца ясна адчувальнае падабенства. Гэта падабенства заўважалі і раней, але яму не надавалі асаблівага значэння. Між тым значэнне гэтага падабенства вельмі вялікае. Пры параўнанні святаў паміж сабой выяўляецца, што часткова яны складаюцца з аднолькавых складнікаў, часам розна аформленых, а часам і проста тоесных [10].

Аснову калядных абрадаў Заходняга Палесся, як і каляндарнай абраднасці цалкам, па меркаванні С. М. Талстой, складае міфалагічная трактоўка часу, адрозніванне часу сакральнага, стваральнага і звычайнага. Трэба адзначыць, што ў калядных песнях, адных з асноўных структурных кампанентаў беларускіх абрадаў, не знайшла ўвасаблення тая трактоўка часу Каляд, якая падаецца ў шэрагу этналінгвістычных прац і падтрымліваецца некаторымі беларускімі даследчыкамі. Згодна з канцэпцыяй даследчыкаў, народ лічыў калядны час за нячысты, ліхі, небяспечны, паколькі ў пераломныя моманты нібыта сціраецца мяжа паміж гэтым і іншым светам, у чалавечую прастору ўрываюцца іншасветныя істоты, якія шкодзяць людзям. Разам з тым, сваіх нашчадкаў наведваюць святыя дзяды, якіх заклікаюць куццю есці. Тэма дзядоў не ўласціва калядным песням, у іх толькі згадваецца пра тое, што ў хаце, да якой прыйшла калядка, куццю таўкуць. Такім чынам, у каляднай паэзіі міфалагічная карціна свету ўспрымалася як цэласная і несупярэчлівая. Калі б было інакш, то палешукі, пазбаўленыя цвёрдай апоры, знаходзіліся б у стане перманентнага неўрозу. Гэтага не здарылася, таму што на працягу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стагоддзяў, дзякуючы ў тым ліку і каляднай абраднасці, яны выпрацоўвалі спрыяльную карціну свету, адпаведную стратэгію выжывання соцыума на яе аснове і магічныя механізмы абароны ад уздзеяння дэструктыўных сіл. Рытуальна-магічная сфера каляднага фальклору была культурным механізмам рэалізацыі стратэгіі выжывання. Яна грунтавалася на ўяўленні, што чалавек здольны ўступаць у кантакт з вышэйшымі сіламі і магічным шляхам актуалізаваць прэцэдэнтны ўзор ідэальнага [7, с. 7]. Мастацкі свет калядных песень спалучае трансцэндэнтнае, тое, што тычыцца веры ў існаванне вечнага, звязанага з нябеснай сям'ёй і дасканалым светам, і зямное, дыскрэтнае, сакральнае і прафаннае, міфічны хранатоп «тут – цяпер – заўсёды» з бытавой лакальнасцю абраду. Такім чынам, праз магію паэтычнага слова здзяйсняўся крэатыўны акт.

Асаблівасці фарміравання і праяўлення светапогляду нашых продкаў знаходзяць адметнае адлюстраванне ў лакальных традыцыях аг. Хацiслаў. Так на Каляды ў Хацiславе адбываецца абрад ваджэння «казы», што дазваляе нам асобна вылучыць песні тыпу «Каза». Іх функцыяніраванне рэгулюецца самім абрадавым сюжэтам, які выяўляе ўласны план значэнняў, выразна звязаны з міфалогіяй жывёлы і яе значэннем для старажытнага ахвярадаўства. У міфапаэтычнай карціне свету славян каза займае важнае месца [9, с. 98]. У беларускай традыцыі калядная каза ўвасабляе сямейны лад, дабрабыт, ўрадлівасць. Паводле энцыклапедычнага слоўніка «Міфалогія беларусаў», каза магла быць увасабленнем бога, які нараджаецца і памірае [3, с. 251]. У Хацiславе, што было зафіксавана пад час экспедыцыі кафедры этналогіі і фальклору, казе спявалі так: «На гори вовчок з вовчэнятамы, // В долыны коза з козэнятамы. // Як прыйшов вовчок, за козу цоп-цоп, // А вовчэнята за козэнята, // А наша коза испугалася, // В сухы лозойкы захавалася. // Як лягла спаты, ны могла встаты». Тэма смерці ў абрадзе ваджэння «казы» мае працягам тэму ажывання жывёлы і яе ўплыву на ўрадлівасць глебы [6, с. 65].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі казу адорвалі і яна ажывала, ёй спявалі: «Уставай коза, розвэсэлыся, // По цитому дому дай розходыся. // По цитому дому дай розходыся // И господару дай поклоныся. // Дай господару, дай господыни, // Дай ихним дыткам, дай маленечкым». (*Запісана ад Хомік Галіны Іванаўны*)

У фальклярыстыцы вобраз казы разглядаецца ў двух планах. Першы, больш пашыраны, звязаны з вызначэннем аграрна-магічнай функцыі казы, другі, амаль забыты - з разуменнем яе ролі ў абрадзе як ахвярнай жывёлы [2, с. 67]. Паводле «Міфалагічнага слоўніка», даместыкацыя казы адбылася ў горных раёнах у поясе ад Малай Азіі і Месапатаміі да гістарычнага Ірана і датуецца межамі IX - VIII тыс. да н. э. Казёл выступае як рытуальная жывёла ў старажытных германцаў, балтаў і славян. У сялянскім побыце беларуса каза замяняла бедным людзям карову, але часта, не маючы мачымасці трымаць карову, адмаўляліся набыць і казу. Як да свойскай жывёлы селянін ставіўся да казы не вельмі добра, з адценнем знявагі, трымаючы ў галаве яе «чортава» паходжанне. Не забудземся таксама і на прыродны характар казы – вольналюбівы, ініцыятыўны і разумны. Напрыклад, існуе сюжэт, дзе жонка ўцякае ад нялюбага мужа, пераўтварыўшыся ў казу [8, с. 663]. На вобраз казы ў беларускім фальклоры наклаліся дзве традыцыі: язычніцкая і хрысціянская. Паводле першай, каза сімвалізавала сямейны лад, дабрабыт і ўрадлівасць, паводле другой – стварэнне чорта, жывёліна, што цесна звязана з нячыстай сілай. Згодна з этыялагічным міфам, казу зляпіў чорт, пазайздросціўшы творчаму запалу Бога, які стварыў авечак, кароў, каней і, нарэшце, чалавека. Жывёла ў чорта атрымалася не жывой, аж пакуль Бог не ўдыхнуў у яе душу, аднак на выгляд каза засталася падобнай да чорта: рогі, барада, шкляныя вочы… На думку прадстаўніцы расійскай этналінгвістыкі В. Бяловай, сувязь казы з ніжнімі, хтанічнымі сіламі сягае пракаветнай даўніны, а хрысціянская традыцыя толькі ўзмацніла і гіпертрафіравала некаторыя старажытныя вераванні [4, с. 522]. У XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначэнне міфалагічнай семантыкі казы насіла часам суб'ектыўны характар. Так нічым сур'ёзна не абгрунтоўваецца меркаванне Адама Кіркора (1818 – 1886), які лічыў казу ўвасабленнем Грамаўніцы, якая валодае жыццяздольнай сілай [5, с. 74].

Хацiслаўская калядка цікавая момантам не забойства, а сну казы, з якога яна «не магла встаты». Гэты сон нагадвае смяротны сон-смерць, з якога казу трэба вызваліць, выратаваць, падняць. Заклiканнем «Устань, коза, розвэсэлыся» пачынаецца другая частка песні. Тут «розвэсэлыся» азначае «вярніся да жыцця»: у народнай культуры весялосць і смех – метафары жыцця, як сум і слёзы – метафары смерці. Семантыкай урадлiвасці каза, акрамя ўсяго, абавязана сваёй прыроднай плоднасці. Праўда, на думку беларускіх даследчыкаў Ю. Драздова і Л. Салавей, гэта ў першую чаргу датычыць юрлівага казла-самца. З апошнім, пішуць яны, звязаны шэраг фальклорных і лінгвістычных актуалізацый. У прыватнасці, пашырана пабудова найменняў казла–самца ад каранёў, першаснае значэнне якіх было «рабіць паступова-зваротныя рухі» [1, с. 211 - 212]. Акрамя гэтага ў тэксце песні нездарма ўзгадваецца «вовчок з вовчэнятамы». Воўк, паводле беларускага этыялагічнага падання, быў створаны чортам, антыподам Бога і яго супернікам, які зайздросціў Богу (дасканаласці божых стварэнняў) і спрабаваў стварыць сам. Пабачыўшы сабаку, чорт паставіўся да яго крытычна – малы, слабы, - і намерыўся зрабіць лепшага. Зляпіў з гліны большага, з вялікімі зубамі, яго мусілі ўсе баяцца. Тым часам ішоў Бог, і чорт стаў цкаваць свайго звера на Бога: «Кусі яго, кусі!», але чортава стварэнне засталося нерухомым, мёртвым. Тады Бог ажывіў яго, гукнуўшы: «Кусі, воўча, чорта!». Воўк кінуўся на чорта і ўкусіў яго за нагу. Чорт ледзь ратаваўся ад яго на алешыне, абліўшы яе сваёй крывёю [1, с. 89-90].

Такім чынам, абрады і звычаі складаюць важную частку народнага календара, які быў цесна звязаны з патрэбамі эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці і адлюстроўваў міфалагічную спецыфіку ўспрымання часу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыклічнасць сязонаў і месяцаў, кліматычныя ўмовы кожнага з іх і адпаведную ім гаспадарчую спецыфіку, а таксама рэгламентаваў час адпачынку і забаў. Калядная абраднасць Заходняга Палесся прасягнута семантычнымі кодамі і выконвалася першапачаткова з магічнай функцыяй, што знайшло яркае адлюстраванне ў фальклоры.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч ; рэдкал.: С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 591 с.

2. Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры: Брэсцкая вобласць : зборнік / склад. В. А. Захарава ; пад рэд., прадм. Р. Р. Шырмы. – Мінск : Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1973. – 301 с.

3. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – 765с.

4. Белова, О. Коза / О. Белова // Славянские древности : этнолингвист. слов. : в 5 т. / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения и балканистики ; под общ. ред. Н. И. Толстого. – М., 1999. – Т. 2 / Т. А. Агапкина [и др.]. – С. 522–524.

5. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье / под общ. ред. П. П. Семенова. – Репр. воспр. изд. 1882 г. – Минск : Беларус. Энцыкл., 1993. – 490 с.

6. Кавалёва, Р. Абрысы рытуальна-магічнай сферы беларускага фальклору : зб. арт. / Р. Кавалёва. – Мінск : Бестпрынт, 2005. – 183 с.

7. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М. : Индрик, 2005. – 599 с.

8. Топоров, В. Козел / В. Топоров // Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – 2-е изд. – М., 1991. – Т. 1. – С. 663–664.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. – Мінск : Респ. ін-т выш. шк., 2010. – Вып. 7. – 371 с.

10. Фольклор и постфольклор: структура, типология, семиотика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ruthenia.ru/folklore/tolstaya2.htm. – Дата доступа: 22.02.2021.

Хвесюк А. А., студент 402 группы
Научный руководитель – Сапотько П. М.,
старший преподаватель

## МОДЕЛЬНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 21 ноября 2019 года №423 «О модельной деятельности», модельной деятельностью является «деятельность по подбору, обучению, созданию образов, трудоустройству физических лиц, внешность которых используется для демонстрации товаров (результатов выполнения работ, оказания услуг) в целях их рекламы и (или) продажи» [2].

В настоящий момент данная деятельность является конкурентоспособной и привлекательной сферой для многих компаний. Помимо моделей в этой сфере задействованы фотографы, стилисты, визажисты, дизайнеры, скауты, букеры и представители других профессий.

Модельное дело можно также понимать и как общественно полезную деятельность, которая осуществляется в порядке личной инициативы, целью которой является производство услуг для удовлетворения определенных потребностей.

В Беларуси функционирует Центр «Национальная школа красоты» – государственное учреждение образования, созданное в 1996 году по поручению Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко. Национальная школа красоты предоставляет комплекс образовательных услуг по

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ